№4 (289)
2011

# Права на волю

Праваабарончы бюлетэнь

## Праваабарончы цэнтр "Вясна" гэта:

Няўрадавая праваабарончая арганізацыя, створаная ў красавіку 1996 году падчас масавых акцыяў пратэсту дэмакратычнай апазіцыі ў Беларусі, якая пасьля арыштаў удзельнікаў дэманстрацыяў займалася дапамогай арыштаваным і іх сем'ям. Таму першапачаткова арганізацыя мела назву "Вясна-96". 15 чэрвеня 1999 году арганізацыя была зарэгістраваная як Грамадзкае аб'яднаньне "Праваабарончы цэнтр "Вясна". Уяўляе сабой рэспубліканскае аб'яднаньне з цэнтрам у Менску і рэгіянальнымі арганізацыямі ў большасьці буйных гарадоў Беларусі. Па ўсёй краіне колькасьць сяброў складае каля 200 чалавек. Рашэньнем Вярхоўнага суда Рэспублікі Беларусь 28 кастрычніка 2003 году за ўдзел у назіраньні падчас прэзідэнцкіх выбараў 2001 г. Грамадзкае аб'яднаньне "Праваабарончы цэнтр "Вясна" было беспадстаўна пазбаўленае дзяржаўнай рэгістрацыі, а 6 сакавіка 2004 году ПЦ "Вясна" быў прыняты ў Міжнародную Федэрацыю Правоў Чалавека (FIDH).

*Сярод міжнародных і замежных партнёрскіх арганізацыяў "Вясны":*

– FIDH (Міжнароднай Федэрацыі правоў чалавека);
– ENEMO (Міжнароднага аб'яднаньня па арганізацыі назіраньня за выбарамі);
– IDEE (Вашынгтон);
– Міжнародная Амністыя;
– Дом правоў чалавека (Нарвегія);
– Інстытут правоў чалавека (Расія, Масква);
– Шведзкі Хельсінкскі камітэт па правах чалавека.

*Праваабарончыя матэрыялы можна таксама прачытаць на сайтах: www.spring96.org; www.charter97.org; www.baj.by*



"Чарнобыльскі Шлях". Менск, 26 красавіка 1996 году.

# Каб пабачыць Беларусь свабоднай...

## Праваабарончаму цэнтру "Вясна" – 15 гадоў

*У час, калі ў Беларусі шалеюць арганізатары палітычных распраў над апанентамі існуючага рэжыму, праваабарончы цэнтр "Вясна" адзначае пятнаццацігодзьдзе свайго стварэньня. Пра сьвяткаваньне праваабаронцам думаць у гэты час не выпадае, але азірнуцца на зробленае і акрэсьліць арыенціры на бліжэйшую будучыню – магчыма. Гэта робіць старшыня і стваральнік праваабарончага цэнтру "Вясна"* **Алесь БЯЛЯЦКІ**.

Гісторыя праваабарончага цэнтру "Вясна" пачалася з тых драматычных падзеяў, якія адбыліся 15 гадоў таму. Сітуацыя вясной 1996 году была вострай і напружанай: беларускае грамадзтва супраціўлялася маштабным парушэньням Канстытуцыі, абмежаваньням грамадзкіх і палітычных свабодаў, якія пачаў усё актыўней дазваляць сабе малады на той час прэзідэнт. Лукашэнка пачаў відавочна закручваць гайкі дзеля таго, каб канчаткова падпарадкаваць сабе ўсе галіны ўлады і ўрэшце перапісаць канстытуцыю "пад сябе". І менавіта ягоныя рашучыя крокі напа-

(Працяг на стар. 4-5)



# "Сьпісы неўяздных" недапушчальныя

## Заява Назіральнай Рады Камітэту міжнароднага кантролю

У сьвятле ўзбуджэньня ў дачыненьні да Беларусі Маскоўскага механізму і заяваў у адказ прадстаўнікоў МЗС Рэспублікі Беларусь аб тым, што Беларусь няўхільна выконвае ўсе абавязацельствы АБСЕ ў сферы чалавечага вымярэньня, арганізацыі-ўдзельнікі Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі выказваюць заклапочанасьць сітуацыяй, якая склалася вакол прадстаўнікоў Міжнароднай назіральнай місіі, створанай пад эгідай Камітэту.

16 сакавіка 2011 г. кіраўнік Міжнароднай назіральнай місіі, грамадзянін Расійскай Федэрацыі Андрэй Юраў быў затрыманы супрацоўнікамі міліцыі і дастаўлены ў РУУС Савецкага раёну, дзе прабыў усю ноч. У дачыненьні да яго разглядалася пытаньне аб узбуджэньні крымінальнай справы па факце незаконнага перасячэньня мяжы. Раніцай 17 сакавіка 2011 г. была вынесеная пастанова аб адмове ва ўзбуджэньні крымінальнай справы з загадам яму пакінуць тэрыторыю Беларусі цягам 24 гадзінаў. Андрэя Юрава таксама апавясьцілі аб унясеньні яго ў "Сьпіс асобаў, уезд якіх у рэспубліку Беларусь забаронены або непажаданы" да 15.02.2013 году.

Раней, 9 сакавіка 2011 году, падобны выпадак адбыўся з украінскім праваабаронцам, які накіроўваўся ў Беларусь для працы ў Міжнароднай назіральнай місіі, – Максімам Кіцюком.

Далей, 20 красавіка 2011 г. пры перасячэньні ўкраінска-беларускай мяжы па прычыне ўнясеньня ў згаданыя вышэй сьпісы была затрыманая інфармацыйныя памочнік Прадстаўніка Міжнароднай назіральнай місіі, грамадзянка Украіны Марына Цапок.

На наступны дзень, 21 красавіка, яшчэ аднаму ўкраінскаму праваабаронцу, які накіроўваўся ў Місію, Міхаілу Каменеву быў таксама забаронены ўезд у Рэспубліку Беларусь.

Праваабаронцы Андрэй Юраў, Максім Кіцюк, Марына Цапок, Міхаіл Каменеў, знаходзячыся на тэрыторыі Беларусі, дзейнічалі адкрыта і на падставе нормаў ААН і АБСЕ аб праваабарончай дзейнасьці ажыцьцяўлялі маніторынг сітуацыі з правамі чалавека ў адпаведнасьці з міжнароднымі абавязацельствамі, узятымі на сябе Рэспублікай Беларусь.

У адпаведнасьці з гэтымі абавязкамі, ізноў пацьверджанымі на саміце кіраўнікоў дзяржаваў і ўрадаў дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ, які прайшоў у Астане 1-2 сьнежня 2010 году, пытаньні правоў чалавека зьяўляюцца прадметам прамой і легітымнай заклапочанасьці ўсіх дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ і міжнароднага грамадзянскай супольнасьці і не зьяўляюцца выключна унутранай справай адпаведнай дзяржавы.

Падобныя дзеяньні могуць быць расцэненыя як прамыя перашкоды Міжнароднай назіральнай місіі. Нам уяўляецца, што дзеяньні з боку ўладаў Беларусі ў дачыненьні да праваабаронцаў дэманструюць грэбаваньне міжнароднымі абавязацельствамі АБСЕ, узятымі на сябе Рэспублікай Беларусь, у прыватнасьці, прама супярэчаць палажэньням Маскоўскага дакументу АБСЕ (перш за ўсё ў частцы п.п. 43.2, 43.3).

**Мы лічым, што дэманстрацыя рэальнай прыхільнасьці прынцыпам АБСЕ магчымая толькі пры ўмове зьдзяйсьненьня Рэспублікай Беларусь наступных дзеяньняў:**

– неадкладнай адмены забароны на ўезд прадстаўнікоў Міжнароднай назіральнай місіі і спрыяньня Камітэту міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі ў ажыцьцяўленьні назіраньня за ўмовамі ў галіне чалавечага вымярэньня і праверкі выкананьня адпаведных міжнародных абавязацельстваў;

– выдаленьня са "Сьпісу асобаў, уезд якіх у Рэспубліку Беларусь забаронены або непажаданы" імёнаў дзеючых міжнародных праваабаронцаў, перш за ўсё, прадстаўнікоў Міжнароднай назіральнай місіі Андрэя Юрава, Максіма Кіцюка, Марыны Цапок і Міхаіла Каменева;

– прынясеньня афіцыйных выбачэньняў вышэйзгаданым праваабаронцам за затрыманьне і час, праведзены ў месцах прымусовага ўтрыманьня.

Мы таксама заклікаем іншыя грамадзкія арганізацыі з дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ, а таксама міжнародныя няўрадавыя арганізацыі далучыцца да дадзеных патрабаваньняў і накіраваць іх уладам Рэспублікі Беларусь.

**ДАВЕДКА:**

**Міжнародныя абавязацельствы Рэспублікі Беларусь у сферы правоў чалавека, зноў пацьверджаныя на Саміце кіраўнікоў дзяржаваў і ўрадаў дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ, які прайшоў у Астане 1-2 сьнежня 2010 году, мяркуюць, што пытаньні правоў чалавека зьяўляюцца прадметам прамой і легітымнай заклапочанасьці ўсіх дзяржаваў-удзельніцаў АБСЕ і міжнароднай грамадзянскай супольнасьці, а не толькі ўнутранай справай адпаведнай дзяржавы.**

**Міжнародная назіральная місія створана Камітэтам міжнароднага кантролю за сітуацыяй з правамі чалавека ў Беларусі, які аб'ядноўвае прадстаўнікоў праваабарончых арганізацыяў краінаў прасторы АБСЕ і міжнародных грамадзянскіх сетак і арганізацыяў, для ажыцьцяўленьня маніторынгу агульнай сітуацыі з захаваньнем фундаментальных правоў чалавека ў Рэспубліцы Беларусь, а таксама пытаньняў абароны праваабаронцаў і забесьпячэньня іх прафесійнай дзейнасьці.**

# З дня народзінаў – за краты

Сход актывістаў грамадзянскай кампаніі "Наш дом" 19 красавіка скончыўся затрыманьнямі і судамі над яго ўдзельнікамі. Фармальна ён быў прымеркаваны да нядаўнага дня народзінаў журналіста і праваабаронцы Валерыя Шчукіна, але ягоныя "госьці" зьбіраліся абмеркаваць і свае надзённыя пытаньні – у тым ліку сітуацыю з выхадам газетаў "Витебский курьер" і "Наш дом". Сталічныя міліцыянты ўварваліся ў кватэру В. Шчукіна. Праверыўшы дакументы ў прысутных, міліцыянты сышлі, але вярнуліся зноў з ператрусам і затрыманьнямі. У Фрунзенскае РУУС было дастаўлена 18 чалавек, увечары ўсіх адпусьцілі, акрамя чатырох – Вольгі Карач, Паўла Левінава, Алега Баршчэўскага і Паўла Станеўскага. Ноч яны правялі ў ізалятары на Акрэсьціна. 20 красавіка суд Фрунзенскага раёну Менску пакараў па абвінавачаньні ў дробным хуліганстве (арт. 17.1 КаАП) В. Карач штрафам у памеры 700 тыс. руб., А. Баршчэўскага і сябра БХК праваабаронцу П. Левінава арыштам тэрмінам на 10 сутак.

# "Мой лёс у вашых руках..."

## Зьміцер Бандарэнка асуджаны на 2 гады калоніі


Фота svaboda.org
Зьміцер БАНДАРЭНКА.

26 красавіка суд Першамайскага раёну Менску разглядаў крымінальную справу супраць Зьмітра Бандарэнкі, каардынатара "Эўрапейскай Беларусі", даверанай асобы кандыдата ў прэзідэнты Андрэя Саньнікава. Яго абвінавацілі па частцы 1 артыкулу 342 Крымінальнага кодэксу (арганізацыя і падрыхтоўка дзеяньняў, якія груба парушаюць грамадзкі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх). Працэс вяла суддзя Тацяна Рывінская. Адвакат – Мар'яна Сямешка. Падчас суда Зьміцер Бандарэнка прызнаў, што ўдзельнічаў у масавай акцыі 19 сьнежня. Па астатніх пунктах абвінавачаньня Бандарэнка вінаватым сябе ня лічыць. У ходзе працэсу ніякіх істотных доказаў "віны" Бандарэнкі прадстаўлена не было. Пісьмовыя матэрыялы крымінальнай справы збольшага ўяўлялі сабой раздрукоўкі тэлефонных размоваў Бандарэнкі з Андрэем Саньнікавым, Наталяй Радзінай, Віктарам Івашкевічам і іншымі. Бандарэнка абурыўся тым, што з верасьня 2010-га ягоны тэлефон праслухоўваўся. У судзе былі праслуханыя некаторыя аўдыёзапісы гутарак і прагледжаныя відэафільмы. На адным з іх Бандарэнка разам з Андрэем Саньнікавым крычалі на плошчы: "Пора менять лысую резину!". Бандарэнка пацьвердзіў гэта, заявіўшы, што неабходна мяняць дзяржаўны механізм, а падзеі ў эканоміцы толькі даказваюць тое, пра што казалі ў сваіх праграмах кандыдаты ў прэзідэнты.

З усіх апытаных сьведак абвінавачаньня пазнаў Бандарэнку толькі адзін супрацоўнік ДАІ. Усе астатнія яго ня бачылі падчас акцыі 19 сьнежня. Апытаныя супрацоўнікі ДАІ сьцьвярджалі, што ўдзельнікі акцыі выйшлі на праезную частку праспэкту Незалежнасьці, чым перашкодзілі руху транспарту. Ня ўсе сьведкі абвінавачаньня давалі паказаньні як пад капірку. Сьведка Дуброўскі, супрацоўнік ДАІ, сказаў, што мітынгоўцы паводзілі сябе хутчэй мірна. Сьведка Бабарыка, былы супрацоўнік ДАІ, сказаў, што супрацоўнікі ДАІ не ўжывалі гучнай сувязі для папярэджаньняў маніфестантаў. Ён таксама паведаміў, што дэманстранты не прарываліся праз ланцуг супрацоўнікаў ДАІ. Сьведка ня чуў, каб хто-небудзь з кандыдатаў аддаваў загад натоўпу ўчыняць незаконныя дзеяньні.

У заключным слове абвінавачаны заявіў, што ўдзельнікі мітынгу рэалізавалі сваё канстытуцыйнае права на мірныя сходы. Беларусы пратэставалі супраць сфальсіфікаваных выбараў, і прыйдзе час, калі шмат каго спытаюць: чаму не пратэставаў ён? Паводле словаў Зьмітра Бандарэнкі, сапраўдныя страты – на мільярды даляраў – прынесьлі краіне тыя, хто пасадзіў за краты кандыдатаў у прэзідэнты і перашкодзіў дэмакратычнаму выхаду краіны з палітычнага і эканамічнага крызісу. Завяршаючы выступ, Бандарэнка зьвярнуўся да суддзі Тацяны Рывінскай: "Наш слоган быў такі: гісторыя робіцца сёньня, гісторыю робім мы. Першую частку слогану прыдумаў я, другую – Андрэй Саньнікаў. І сапраўды, сёньня робіцца гісторыя. Высокі суд! На вас з надзеяй глядзіць наша сям'я, на вас з надзеяй глядзяць вельмі шмат грамадзянаў Беларусі. На вас з надзеяй глядзяць шмат людзей, якія цікавяцца сітуацыяй у Беларусі. Як кажуць, узмах матылька можа нарадзіць новы сусьвет. Беларускі суд валодае сілай, большай за ўзмах матылька. Мой лёс у вашых руках, але, магчыма, болей, чым мой лёс. Але я гатовы прыняць любое вашае рашэньне".

27 красавіка суддзя Тацяна Равінская агучыла прысуд Зьмітру Бандарэнку – 2 гады калоніі агульнага рэжыму (ч. 1 арт. 342 КК). Дзяржабвінаваўца Сіманоўскі прасіў пакараць максімальным тэрмінам паводле гэтага артыкулу – трыма гадамі пазбаўленьня волі. Напярэдадні вынясеньня прысуду Зьміцер Бандарэнка выглядаў вельмі спакойным, трымаўся ўпэўнена, сядзеў у клетцы, чытаючы "Беларусы і рынак".

## Марэк Мігальскі ўзяў шэфства над Зьмітром Бандарэнкам

**Марэк Мігальскі, дэпутат Еўрапейскага Парламенту і сябра-намесьнік Дэлегацыі па суадносінах Беларусь – ЕЗ, у межах кампаніі праваабарончай арганізацыі Libereco ўзяў шэфства над Зьмітром Бандарэнкам. "Як сябра-намесьнік у Дэлегацыі ЕЗ-Беларусь, я ўважліва сачу за сітуацыяй у Беларусі. Нягледзячы на тое, што Беларусь зьяўляецца часткай Еўропы, улады робяць усё, каб абмежаваць асноўныя правы сваіх грамадзянаў. Ход прэзідэнцкіх выбараў ня меў нічога агульнага з дэмакратыяй. (...) Я хацеў бы выказаць сваю падтрымку аднаму з палітычных вязьняў – Зьмітру Бандарэнку, якога менскі суд асудзіў на 2 гады калоніі за ўдзел у масавых беспарадках 19 сьнежня 2010 г. (...) Катэгарычна заклікаю беларускія ўлады да адмены абвінавачаньняў і неадкладнага вызваленьня Зьмітра Бандарэнкі" – цытуе дэпутата партал "Усходні карэспандэнт".**

**Кампанія шэфства над палітвязьнем ініцыяваная праваабарончай арганізацыяй Libereco-Partnership for Human Rights. Яе мэта – аказаць падтрымку палітычным вязьням і іх сем'ям. Актывісты гэтай арганізацыі абавязваюцца клапаціцца аб тым, каб палітвязьні не былі аддадзеныя забыцьцю, і робяць усё, што ад іх залежыць, для вызваленьня падшэфных палітвязьняў.**

# Каб пабачыць Беларусь свабоднай...

(Пачатак на стар. 1)




чатку былі зьвязаныя з разгонамі масавых акцыяў. Першы жорсткі разгон дэманстрацыі, ды не абыякой, а "Чарнобыльскага Шляху", прысьвечанага трагічнай для беларусаў падзеі, аварыі на Чарнобыльскай АЭС, адбыўся 26 красавіка 1996 году. Перад гэтым прайшла масавая акцыя 25 сакавіка, у гонар БНР, затым 2 красавіка, калі грамадзяне пратэставалі супраць заключэньня саюзнай дамовы з Расіяй, на якую нечакана прыйшло шмат людзей. Але на Чарнобыльскі шлях сабралася яшчэ болей – каля сарака тысячаў грамадзянаў, уся плошча Коласа, абвешчаная месцам збору, была шчыльна запоўненая людзьмі.

Сама акцыя была добра аформленая, у чым бралі ўдзел грамадзка актыўныя мастакі з суполкі "Пагоня", было шмат сьцягоў, харугваў, плакатаў. Дэманстранты сутыкнуліся з праблемамі, калі пачалі выходзіць на праспэкт, каб рухацца ў бок плошчы Перамогі. Адразу ж праспэкт быў перагароджаны некалькімі шэрагамі міліцыянтаў з дубінкамі і нават грузавымі і легкавымі аўтамабілямі. Адбылася вельмі жорсткая сутычка з дэманстрантамі. Хачу нагадаць, што нічога падобнага ў Беларусі не было з кастрычніка 1988 году, калі быў разагнаны мітынг каля Маскоўскіх могілак, прысьвечаны Дзядам. З таго часу ніводная масавая акцыя ў Менску не была разагнаная ўладамі. І вось праз сем гадоў – жорсткае сутыкненьне, у якім у тыя хвіліны былі зьбітыя дзясяткі людзей. Гэта адбывалася на маіх вачах. Памятаю, як мастак Аляксей Марачкін, які нёс абраз Чарнобыльскай Маці Божай, атрымаў удар у вока і ледзь не страціў зрок. Іншыя дэманстранты атрымалі ўдары дубінкамі, былі разьбітыя галовы, некаторыя атрымалі іншыя траўмы. Аднак людзей было так шмат, што міліцыя не была ў стане спыніць людскую плынь, людзі проста адсунулі гэтыя кардоны і пайшлі па праспэкце далей. "Чарнобыльскі Шлях" дайшоў да Нямігі і далей да Палацу спорту. Сутыкненьні адбываліся таксама і на Нямізе.

Пасьля акцыі міліцыя затрымала каля сотні яе ўдзельнікаў, была ўзбуджаная крымінальная справа, адразу былі арыштаваныя Юрый Хадыка і Вячаслаў Сіўчык. Мяне таксама выклікалі ў пракуратуру па гэтай справе ў якасьці сьведкі. У грамадзтве быў пэўны шок, паколькі нічога падобнага не здаралася шмат гадоў. Таму ўзьнікла пільная патрэба ў тэрміновым зборы інфармацыі: дзе хто сядзіць, хто дзе знаходзіцца, патрэбна было аказваць дапамогу арыштаваным, у першую чаргу сем'ям Хадыкі і Сіўчыка, самі яны ў зьняволеньні абвясьцілі галадоўку. Менавіта тады на базе актывістаў Беларускага народнага фронту ўзьнікла група дапамогі ахвярам палітычных рэпрэсіяў, якую я, будучы на той час сакратаром Управы Беларускага народнага фронту, і ачоліў. Гэта было натуральным для мяне рашэньнем, паколькі праблемы, зьвязаныя з абаронай правоў чалавека, заўсёды прысутнічалі ў маім жыцьці. Я быў адным з заснавальнікаў першай праваабарончай беларускай арганізацыі "Мартыралог Беларусі", а затым, будучы дэпутатам Менскага гарадзкога савету, уваходзіў у склад гарадзкой камісіі па рэабілітацыі рэпрэсаваных у 30-я–50-я гады. Хаця на той час здавалася, што праца нашая па дапамозе новай хвалі рэпрэсаваных будзе часовай. Калі б тады нехта сказаў, што мы будзем працаваць 15 гадоў і што грамадзка-палітычная сітуацыя ня толькі не палепшыцца, але і істотна пагоршыцца па ўсіх пазіцыях: і ў заканадаўчым плане, і ў ціску на грамадзтва, і ў адносінах уладаў да грамадзянскай супольнасьці – я ніколі б не паверыў у гэта.

На той час, сем гадоў адпрацаваўшы дырэктарам Літаратурнага музею Максіма Багдановіча, я зрабіўся практычна прафесійным музейшчыкам, чалавекам, які бачыў сваё будучае жыцьцё ў беларускай культуры, у літаратуры, а ня толькі ў грамадзка-палітычнай сферы, як яно і склалася надалей.

Тым ня менш, беларускаму грамадзтву быў кінуты выклік, найперш у мэтавым і пасьлядоўным перасьледзе актывістаў грамадзянскай супольнасьці. І гэты выклік быў прыняты. Мы пачалі збор сродкаў для дапамогі пацярпелым. Самае цікавае, што памятаецца дагэтуль, гэта тое, што дапамога збольшага была харчовай. Адзін з маіх добрых знаёмых выдзеліў два ці тры цэнтнеры харчоў (макаронаў, цукру, грэчкі, алею). На мікрааўтобусе харчы перавезьлі ў музей Багдановіча і там, разам з калегамі, фасавалі ўсё гэта ў пакункі з эмблемай музею і перадавалі тым, хто быў зьбіты ці сядзеў на сутках. Карацей, дапамагалі, чым маглі. Шмат харчоў перадалі сем'ям Сіўчыка і Хадыкі. Такім быў пачатак нашай "Вясны", і як бачна – пачатак сімвалічны. Зараз, на 25-годзьдзе Чарнобыля, ізноў прагучала, што ў Беларусі ўсе гэтыя гады адбываецца Чарнобыль ня толькі фізічны, датычны нашага здароўя, але і духоўны, датычны духоўнага здароўя беларусаў. Выразныя праявы гэтага духоўнага Чарнобылю мы атрымалі ад новай беларускай улады, якая ўмацоўвалася, мацярэла, тачыла зубы на маладыя дэмакратычныя парасткі, якія тады прабіліся на беларускай грамадзкай глебе. Ад таго часу мы працягвалі сваю працу на валанцёрскіх пачатках, у вольны ад асноўнай працы час. Неўзабаве пачаліся новыя крымінальныя справы, напрыклад, справа супраць паэта Славаміра Адамовіча, і мы аказвалі матэрыяльную дапамогу ягоным родным, калі ён сядзеў у СІЗА.

Дапамога ахвярам палітычных рэпрэсіяў стала адной з нашых галоўных задачаў, якой мы і займаемся з тых часоў. Калі згадаць, хто быў першым у складзе нашай групы – магу назваць Галіну Вашчанку, Маю Кляшторную, дачку беларускага паэта Тодара Кляшторнага, рэпрэсаванага, як і яна сама, уласна я, некалькі чалавек з нашага музейнага калектыву, якія таксама дапамагалі нам.

Апроч матэрыяльнай дапамогі мы ад самага пачатку пачалі займацца зборам інфармацыі па рэпрэсаваных. Я нагадаю, што пасьля тых падзеяў выйшла кніжка, якая так і называлася "Менская Вясна–1996", дзе былі апісаныя падзеі Чарнобыльскага шляху-96, сабраныя факты рэпрэсіяў у дачыненьні да ўдзельнікаў "Чарнобыльскага Шляху", зьмешчаны сьпіс рэпрэсаваных. Інфармацыю даводзілася зьбіраць з розных крыніцаў, напрыклад, з газеты "Свабода", якая часта зьмяшчала такія зьвесткі, і непасрэдна ад саміх удзельнікаў акцыяў, якіх мы апытвалі пра тое, што з імі здарылася. Хроніку парушэньняў правоў чалавека мы пачалі ствараць практычна ад самага пачатку сваёй дзейнасьці, і ў розных варыянтах займаемся гэтым і цяпер. Гэта важны накірунак нашай працы.

Дзейнасьць, якой мы займаемся 15 гадоў, складаная, цяжкая. Яна забірае шмат нервовай энергіі. Няпроста ўвесь час займацца тымі праблемамі, якія ўзьнікаюць у людзей у барацьбе за свае правы, але тым ня менш, я маю вялікае маральнае задавальненьне з таго, што зроблена за паўтара дзясяткі гадоў у межах нашай арганізацыі, што зроблена "Вясной" у межах беларускага і міжнароднага праваабарончага руху. Нашая праца адзначаная некалькімі аўтарытэтнымі міжнароднымі прэміямі. За гэтыя 15 гадоў "Вясна" разраслася да рэспубліканскай арганізацыі, прадстаўніцтвы і актывісты якой ёсьць практычна ва ўсіх вялікіх гарадах Беларусі. Ёсьць задавальненьне ад зробленага і ёсьць вялікае незадавальненьне ад таго, што не выкананая асноўная мэта стварэньня нашай арганізацыі – у Беларусі працягваюць масава парушацца правы чалавека, Беларусь не далучылася да сям’і цывілізаваных краінаў. Гэтая мэта – бачыць Беларусь свабоднай, дэмакратычнай і прававой краінай, дзе б сапраўды шанаваліся правы чалавека, – прымушае нас рухацца наперад. Пакуль гэтая мэта ня будзе дасягнутая, мы будзем працаваць у гэтым накірунку і далей.

# Арышт за арыштам...

***Сяргей Каваленка зноў пад арыштам і зноў абвясьціў галадоўку пратэсту...***

22 красавіка віцебскага актывіста КХП БНФ зноў забралі ў ізалятар часовага ўтрыманьня. Дасланы па яго міліцэйскі канвой патлумачыў, што актывіст мусіць "адседзець" яшчэ 12 сутак – дабыць тэрмін арышту, з-пад якога яго выпусьцілі 8 красавіка.

Апазіцыянер адразу абвясьціў, што будзе працягваць галадоўку пратэсту супраць несправядлівых, на яго думку, прысудаў і ўвогуле незаконнай дзейнасьці сілавых структураў.

Сяргей Каваленка нагадаў гісторыю апошніх арыштаў і галадовак пратэсту: "25 сакавіка мне далі 7 сутак арышту за акцыю да Дня Волі: я выйшаў у цэнтр Віцебску з трыма бел-чырвона-белымі сьцягамі. Адразу ў ІЧУ я абвясьціў галадоўку пратэсту. Калі 1 красавіка я выйшаў з ізалятару часовага ўтрыманьня, мяне зноў затрымалі міліцыянты. У Першамайскім РАУС мне патлумачылі, што адпраўляюць на новы арышт – ужо паводле рашэньня крымінальна-выканаўчай інспекцыі. Інспекцыя адправіла мяне ў ІЧУ ўжо на 15 сутак, бо летась мне прысудзілі тры гады абмежаваньня волі "ўмоўна" пасьля вывешваньня бел-чырвона-белага сьцягу на навагодняй елцы і цяпер акцыю са сьцягамі прызналі парушэньнем рэжыму адбываньня пакараньня. Пад другім арыштам я аднавіў галадоўку".

На 11 суткі галадоўкі актывіст трапіў у кардыялагічнае аддзяленьне гарадзкой бальніцы. 8 красавіка яго выпісалі і адразу ж адпусьцілі дахаты: як патлумачылі ў ІЧУ, на час разьбіральніцтва па ягоных скаргах.

Актывіст падаваў скаргі ў гарадзкую пракуратуру, але там вырашылі, што абодва арышты цалкам законныя. Цяпер Сяргей Каваленка будзе знаходзіцца ў ІЧУ да 4 траўня.

**Віншуем!**

# Медаль Міланскага марафону

Наш калега, юрыст Праваабарончага цэнтру "Вясна" з Маларыты Уладзімір Малей прыняў удзел у знакамітым Міланскім марафоне, дзе бралі ўдзел больш за тры тысячы бегуноў з ўсяго сьвету.




Беларускі праваабаронца прабег дыстанцыю хутчэй за 6 гадзінаў і атрымаў медаль спаборніцтваў. Спадар Малей паведаміў, што свой забег прысьвяціў Беларусі.

Віншуем Уладзіміра Малея і жадаем яму далейшых перамог – спартыўных і прафесійных.

# За мужнасьць і гуманнасьць

Уладзімір Целяпун узнагароджаны Чарнобыльскім Крыжом за мужнасьць, годнасьць і гуманнасьць. Праваабарончы цэнтр "Вясна" віншуе свайго сябра, які атрымаў гэтую ўзнагароду як ліквідатар аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Узнагарода Уладзіміру Целепуну была перададзеная з Кіева, дзе 27 красавіка адбылася ўрачыстая цырымонія.

"На жаль, нас не паважаюць у роднай краіне за тую працу, якую мы зрабілі ў 1986 годзе. Таму мы прымаем узнагароды ад нашых суседзяў. Яны клапоцяцца ня толькі пра сваіх ліквідатараў, але і пра ўсіх, хто ўдзельнічаў у ліквідацыі аварыі. У тым ліку пра беларусаў ", – так пракаментаваў узнагароду Уладзімір Целяпун.

Праваабаронца і надалей мае намер працягваць сваю дзейнасьць па абароне ад наступстваў чарнобыльскай катастрофы не толькі ліквідатараў, але і ўсіх жыхароў Мазыра. Ордэн "Чарнобыльскі Крыж: Мужнасьць. Годнасьць. Гуманнасьць" зьяўляецца вышэйшай узнагародай Усеўкраінскай грамадзкай арганізацыі "Саюз Чарнобыль Украіны".

# За 7 дзён – 9 папярэджаньняў...

Пасьля тэракту ў менскім метро значна ўзмацніўся ціск на супрацоўнікаў незалежных масмедыя ў Беларусі. Так, за тыдзень з 12 па 19 красавіка 2011 г. пракуратура, Міністэрства інфармацыі і КДБ папярэджвалі асобных журналістаў і калектывы рэдакцыяў ажно 9 разоў. Асабліва жорсткім для супрацоўнкаў СМІ выдаўся дзень 14 красавіка. Прыводзім пералік ужытых дзяржаўнымі органамі да прэсы санкцыяў:

**1.** *12 красавіка* Генпракуратура вынесла папярэджаньне рэдактару інтэрнэт-газеты "Салідарнасьць" Аляксандру Старыкевічу за "распаўсюджваньне неабгрунтаванай інфармацыі аб трагічных падзеях у Менскім метрапалітэне". А. Старыкевіч быў першым з беларускіх журналістаў, хто па гарачых сьлядах выклаў усе верагодныя версіі тэракту. Аднак пракуратура палічыла ягоныя развагі "неабгрунтаванымі зьвесткамі і дадумкамі, накіраванымі на дыскрэдытацыю беларускага грамадзтва і дзяржавы".

**2.** *14 красавіка* рэдактара газеты "Бабруйскі кур'ер" Анатоля Санаценку паспрабавалі запрасіць на размову ў раённую пракуратуру, але ён адмовіўся ісьці бяз позвы. Тады замест абяцанай позвы яму прывезьлі афіцыйную паперу, падпісаць якую ён адмовіўся. Падставай стала публікацыя А. Санаценкі ў блогу на сайце "Беларускі партызан", што тычылася тэракту. 18 красавіка Анатоль Санаценка атрымаў папярэджаньне па пошце.

**3.** *14 красавіка* папярэджаньне ад Мінінфармацыі атрымала рэгіянальная газета "Узгорак". Горацкае выданьне пакаралі за адсутнасьць штрых-коду на газеце, а таксама за тое, што рэдакцыя не папярэдзіла міністэрства пра зьмену рэдактара. Пры гэтым кіраўнік рэдакцыі зьмяніўся толькі з прычыны сьмерці ранейшага рэдактара газеты Эдуарда Брокарава.

**4.** *14 красавіка* Міністэрства інфармацыі накіравала на адрас рэдакцыі "Нашай Нівы" папярэджаньне пра недапушчальнасьць парушэньня нормаў закону "Аб СМІ", палічыўшы непраўдзівай апублікаваную ў газеце інфармацыю пра тое, што адна з ахвяраў тэракту 11 красавіка знаходзілася на станцыі да позьняга вечару. Гэта, на думку Мінінфармацыі, наносіць шкоду грамадзкім інтарэсам, дыскрэдытуе органы дзяржаўнай улады, выратавальныя і медыцынскія службы, што бралі ўдзел у аказаньні дапамогі пацярпелым у выніку тэракту. Пры гэтым журналісты выданьня пісалі пра падзеі са словаў сьведкі, указалі яго імя і прозьвішча, як і імя гераіні матэрыялу. Было зьмешчанае і яе фота.

**5.** *15 красавіка* Мінінфармацыі вынесла папярэджаньне рэдакцыі "Народнай волі" – "у сувязі з распаўсюдам выданьнем зьвестак, не адпаведных рэчаіснасьці і зьневажальных для дзелавой рэпутацыі Белтэлерадыёкампаніі". Факт распаўсюду такіх зьвестак нібыта быў устаноўлены 13 красавіка рашэньнем Вышэйшага гаспадарчага суда, які разглядаў пазоў Белтэлерадыёкампаніі да "Народнай Волі". БТ пакрыўдзілася на артыкул намесьніка рэдактара газеты Сьвятланы Калінкінай "Гаворыць і паказвае Гебельс-ТВ", у якім аналізаваўся прапагандысцкі фільм пра Плошчу-2010 "Плошча. Жалезам па шкле".

**6.** *18 красавіка* ўвечары галоўнага рэдактара "Нашай Нівы" Андрэя Скурко выклікалі на гутарку ў КДБ, дзе ён быў папярэджаны аб адказнасьці за разгалошваньне матэрыялаў сьледзтва па справе аб тэракце 11 красавіка. Цікава, што на наступную раніцу пасьля тэракту прадстаўнікі сьпецслужбы наведалі рэдакцыю "НН" дзеля капіяваньня здымкаў з месца трагічных падзеяў, а пасьля сыходу затэлефанавалі і загадалі прыбраць з сайту адзьнятае там відэа.

**7.** *19 красавіка* рэдактар крычаўскай незалежнай газеты "Вольны горад" Сяргей Няроўны атрымаў афіцыйнае папярэджаньне ад гарадзкой пракуратуры – за свой артыкул "Чорныя дні". Незадаволенасьць пракуратуры выклікала тое, што ў артыкуле "утрымліваецца крытыка дзеяньняў вышэйшых службовых асобаў дзяржавы, а таксама службовых асобаў праваахоўных органаў і ходу расьсьледаваньня па крымінальнай справе па факце ўчыненьня тэрарыстычнага акту на станцыі метро "Кастрычніцкая" 11 красавіка".

**8.** *19 красавіка* прадстаўнік пракуратуры прывёз у рэдакцыю "Нашай Нівы" чарговае папярэджаньне. Гэтым разам вострадрэагавала Генеральная пракуратура Беларусі, а падставай стала публікацыя каментару пад назвай "Палкоўнік Барадач: выбухоўку падклалі супрацоўнікі адной са сьпецслужбаў", у якім былы палкоўнік вайсковага сьпецназу выказваў сваё меркаваньне аб магчымых прычынах тэракту. Версія палкоўніка пра тое, што за тэрактам маглі стаяць і праўладныя сілы, зацікаўленыя ў дэстабілізацыі абстаноўкі ў краіне, уладам відавочна не спадабалася.

**9.** *20 красавіка* папярэджаньне атрымала праз пошту рэдакцыя часопісу "Arche. Пачатак". Яно было вынесена Міністэрствам інфармацыі яшчэ 15 красавіка за тое, што "у выходных зьвестках нумару 1–2 часопісу "Arche. Пачатак" за 28 лютага 2011 году адсутнічае імя па бацьку галоўнага рэдактара выданьня, няправільна паведамлена пра нумар пасьведчаньня аб дзяржаўнай рэгістрацыі, а таксама не ўказаны рэспубліканскі орган дзяржаўнага кіраваньня ў сферы масавай інфармацыі, які зарэгістраваў гэты часопіс". Гэта кваліфікавана як парушэньне артыкулу 22 Закону Рэспублікі Беларусь "Аб сродках масавай інфармацыі". Папярэджаньне падпісанае самім міністрам інфармацыі Алегам Праляскоўскім.

У сувязі з апошнімі падзеямі вакол незалежных СМІ грамадзкае аб'яднаньне "Беларуская асацыяцыя журналістаў" прыняло заяву пад назвай "Патрабуем спыніць перасьлед нашых калегаў!"

У заяве, у прыватнасьці, гаворыцца, што "ўлады краіны спрабуюць выкарыстаць любую нагоду, каб змусіць замаўчаць нешматлікія вольныя галасы, што засталіся на беларускім інфармацыйным полі". БАЖ выказвае вялікі жаль, што нават трагічныя падзеі ў Менску 11 красавіка ня сталі выключэньнем з гэтага сумнага правіла, і выказвае рашучы пратэст у сувязі з перасьледам журналістаў.

Акрамя таго, у заяве нагадваецца пра незаконныя затрыманьні шэрагу журналістаў пасьля тэракту і іх адміністрацыйнае асуджэньне, абмежаваньне доступу да шэрагу інфармацыйных сайтаў і крымінальны перасьлед васьмі сябраў БАЖ, прычым сямі з іх – у рамках справы аб масавых беспарадках 19 сьнежня.

# На "Чарнобыльскі шлях" – праз асабісты дагляд

Актывісты дэмакратычнай апазіцыі правялі штогадовую вулічную акцыю, прысьвечаную 25-годзьдзю аварыі на Чарнобыльскай АЭС. Яна мусіла прайсьці ў выглядзе традыцыйнага шэсьця "Чарнобыльскі шлях" па вуліцах Менску, аднак з прычыны забароны ўладамі адбыўся толькі мітынг у парку Дружбы народаў каля плошчы Бангалор. Тэрыторыю на плошчы Бангалор ахоўнікі правапарадку абгарадзілі жалезнымі турнікетамі, наладзіўшы некалькі прапускных пунктаў. Кожны, хто ішоў на мітынг, мусіў прайсьці асабісты дагляд – праверку зьместу сумак і кішэняў. Гэтым разам міліцыянты перагледалі паперы, якія людзі мелі з сабой і нават спрабавалі перачытваць запісныя кніжкі. Усю працэдуру дагляду і кожнага чалавека здымалі на відэакамеру супрацоўнікі сьпецслужбаў. Вельмі многіх людзей гэта абурыла і абразіла. З прычыны пільнага дагляду многія людзі засталіся стаяць за агароджанай тэрыторыяй. Тыя, хто прайшлі, разгарнулі бел-чырвона-белыя сьцягі і плакаты антыядзернай тэматыкі: "НЕ АЭС у Беларусі", "Астравецкая АЭС? Дзякуй, ня трэба!", "Чарнобыль, Факусіма – што далей?", "Хопіць выбухаў". Кіраўнікі Партыі БНФ Рыгор Кастусёў і Аляксей Янукевіч прынесьлі ікону "Маці Божая Чарнобыльская", Міхась Башура і Аляксей Марачкін – чарнобыльскі звон. Некаторыя з прысутных былі апранутыя ў медычныя халаты, гумавыя пальчаткі, з павязкамі і выявамі ядзернай небясьпекі. Адкрываючы мітынг, адзін з арганізатараў Юры Хадыка сказаў: "Сёлета ўлады ўпершыню з 1989 году не дазволілі жалобнага шэсьця ў дзень угодкаў Чарнобылю, а дазволілі вось гэты мітынг маўчаньня ў парку Дружбы народаў. Я хачу падзякаваць усім, хто тут сабраўся, бо нашая галоўная задача – пераадолець страх у грамадзтве, які быў народжаны жорсткім разгонам мірнай акцыі пратэсту 19 сьнежня. Мы павінныя паказаць, што мы выстаім, што пераможам гэты гвалт, арганізаваны "чорнымі кашулямі". Мы вытрымаем і пераможам".



Выступае Юры ХАДЫКА.

Хвілінай маўчаньня ўдзельнікі мітынгу ўшанавалі памяць навукоўцаў Івана Нікітчанкі і Васіля Несьцярэнкі, а таксама памерлых ліквідатараў. Потым выступалі розныя палітыкі, навукоўцы, медыкі, ліквідатары. Прафесар Георгі Лепін сказаў, што ўсе беларусы зьяўляюцца чарнобыльцамі, бо ўсе яны спажываюць прадукты з утрыманьнем пэўных дозаў радыяцыі. А прафесар Ганчарова заявіла аб вялікай шкодзе для здароўя малых дозаў радыяцыі, якія могуць выклікаць ракавыя захворваньні, колькасьць якіх апошнім часам істотна ўзрасьлі.




На чарнобыльскі мітынг у парк Дружбы народаў прыйшло каля тысячы чалавек. На завяршэньне арганізатары мітынгу зачыталі рэзалюцыі. У першай рэзалюцыі ўтрымліваецца патрабаваньне вызваліць палітвязьняў, а таксама адзначаецца, што прэзідэнцкія выбары прайшлі недэмакратычна, згадваецца пра ператрусы ў офісах незалежнай прэсы, заклікаецца спыніць палітычныя працэсы супраць удзельнікаў Плошчы. Другая рэзалюцыя заклікае аднавіць ільготы і сацыяльныя гарантыі ўдзельнікам ліквідацыі аварыі на ЧАЭС, а таксама адмовіцца ад планаў будаўніцтва АЭС у Беларусі. Па завяршэньні мітынгу ягоныя ўдзельнікі ўсклалі кветкі і паставілі сьвечкі ля капліцы ў памяць ахвяраў чарнобыльскай трагедыі.



# "Мы супраць росту коштаў на паліва"

28 красавіка ў Менску і іншых гарадах краіны прайшла рэспубліканская акцыя "Стоп бензін 2". Аўтамабілісты пратэставалі супраць павышэньня коштаў на паліва. Акцыю ініцыяваў аргкамітэт аб'яднаньня "За аўто". За некалькі гадзінаў да пачатку адзін з арганізатараў акцыі, Арцём Шаркоў, быў выкліканы ў міліцыю і даў падпіску пра тое, што ён "ведае беларускае заканадаўства". "І калі будуць нейкія парушэньні яго, то я траплю пад адміністрацыйную адказнасьць адназначна, а магчыма і пад крымінальную", – распавёў актывіст. Акцыя аўтамабілістаў супраць павышэньня коштаў на паліва пачалася ў Менску а 18 гадзіне. А. Шаркоў і іншыя кіроўцы заправіліся па 2 літры і разьлічыліся купюрамі ў 10, 20 і 50 рублёў. Неабходныя 6600 нават не пралезьлі ў акенца касіра, таму даводзілася перадаваць грошы часткамі. Планавалася, што ў 19.30 аўтамабілісты выедуць на прасьпект Незалежнасьці і з хуткасцю 45-55 км/г праедуць да Нацыянальнай бібліятэкі. Але яшчэ на запраўцы непадалёк ад завода "Крышталь" да А. Шаркова падышлі супрацоўнікі міліцыі і пасьля размовы ён быў затрыманы і дастаўлены ў Ленінскі РАУС дзеля "высьвятленьня асобы". Тым ня менш марш аўтамабілістаў па прасьпекце Незалежнасьці ўсё ж адбыўся. Аднак даішнікі спынялі ўсе машыны, на якіх бачылі налепкі акцыі. Да Нацыянальнай бібліятэкі, дзе меўся адбыцца сход аўтамабілістаў даехаў толькі з дзясятак машынаў. Да іх адразу ж падышлі сьпецназаўцы і загадалі ад'язджаць. У Ленінскім РАУС А. Шаркова пратрымалі дзьве гадзіны, пасьля чаго выпусьцілі і ён прыехаў да Нацыянальнай бібліятэкі, адкуль усе ўдзельнікі акцыі "Стоп бензін-2" накіраваліся да цэнтру "XXI стагоддзе".



Фота svaboda.org

Берасьце, 28 красавіка 2011 году.

**У Віцебску** некалькі дзясяткаў віцебскіх аўтамабілістаў узялі ўдзел у акцыі "Стоп-бензін". Аўтамабілі з налепкамі "Стоп-бензін! Я супраць падвышэньня коштаў на паліва" ўтварылі чаргу на аўтазапраўцы. Кожны набываў па паўтара літры бензіну і разьлічваўся драбязой. Аднак аўтамабілістам не далі праехаць калонай па галоўнай вуліцы гораду. Віцебская ДАІ хутка зарыентавалася ў тым, што адбываецца, і выставіла сваіх супрацоўнікаў каля запраўкі і па меркаваным шляху калоны. Інспектары спынялі аўтамабілі і затрымлівалі іх, дасканальна правяраючы. Аднаго з удзельнікаў аштрафавалі за тое, што ён, нібыта, размаўляў па тэлефоне падчас руху. Абураныя такімі адносінамі аўтамабілісты выказалі намер правесьці наступную акцыю пад назваю "Стоп-ДАІ".




Фота svaboda.org

**У Берасьці** каля трох дзясяткаў аўтамабіляў прынялі ўдзел у акцыі "Стоп-бензін". На заяўленым месцы збору на пляцы каля "Брэсцкай крэпасьці", акрамя аўтамабілістаў, прысутнічала вялікая колькасьць сілавікоў. А 17:30 на месца збору пратэстоўцаў прыехалі супрацоўнікі КДБ, амапу. Удзельнікаў акцыі папярэдзілі, што мерапрыемства не павінна стаць масавай акцыяй, якая не дазволена.

Большасьць прысутных на акцыі, якая прадугледжвала рух у калоне праз увесь горад на хуткасьці каля 30 км/г і набыцьцё на залівачнай станцыі "Белнафтахім" мінімальнай колькасьці паліва з аплатай дробнымі купюрамі, даведалася пра мерапрыемства з інтэрнэту. Акцыя прайшла без затрыманьняў. Удзельнікі дарожнага руху віталі калону сігналамі. "Некаторыя нават бралі падчас руху праз вокны ў нас налепкі і далучаліся да акцыі. Людзі зьвярталі ўвагу. Прыпыняліся, далучаліся да нас. Хоць увесь час нас суправаджалі аўтамабілі супрацоўнікаў ДАІ і КДБ, вялі відэаздымкі", – распавёў адзін з арганізатараў мерапрыемства Зьміцер Шурхай.



Фота svaboda.org

Затрыманьне Арцёма ШАРКОВА.

"Права на волю". Праваабарончы бюлетэнь. Выходзіць два разы на месяц.
Наклад 299 асобнікаў. Пры перадруку спасылка на бюлетэнь абавязковая.